# ПЕРСПЕКТЫВЫ КНІГАВЫДАННЯ І КНІЖНАГА ГАНДЛЮ

*Доўнар Л.І. (Мінск)*

## «БЕЛАРУСКАЯ КНІГА Ў КАНТЭКСЦЕ СУСВЕТНАЙ КНІЖНАЙ КУЛЬТУРЫ» Ў АСОБАХ І ПРАЦАХ

Кніжная культура як навуковая парадыгма стала дамінуючай у шэрагу сучасных кнігазнаўчых даследаванняў, большасць з якіх аднак застаецца ў межах дэкларавання катэгорыі «кніжная культура». За рэдкім выпадкам аўтары рызыкуюць рабіць больш глыбокія тэарэтычныя выкладкі.

Асаблівую ролю ў пашырэнні тэмы кніжнай культуры ў Беларусі адыграў навукова-даследчы праект аддзела рэдкіх кніг бібліятэкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў (БДУКМ) «Кніжная культура Беларусі: гісторыка-тэарэтычны аспект» (2006–2010 гг.) (БелІСА). Адным з галоўных вынікаў названай працы з'явіўся навуковы зборнік «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» (створаны ў 2006 г.), які і па завяршэнні тэмы навукова-даследчыцкай работы (НДР) працягвае пачатую справу і спрыяе пазнанню і адаптацыі міжнароднага вопыту, прадстаўляе айчынную нацыянальную кнігазнаўчую школу, у тым ліку і праз персанальнае кнігазнаўства («Personalia»).

Сёлета праекту «Беларускай кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» спаўняецца дзесяць гадоў, на працягу якіх выйшлі шэсць друкаваных выпускаў зборніка і адно электроннае выданне [1–8]. Першы выпуск (2006 г.), які быў надрукаваны ў дзвюх частках [1; 2], а таксама яго дапоўненае і пашыранае электроннае выданне 2007 г. [3] уключалі даклады Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» (7–8 лютага 2006 г.), на якой абмяркоўваліся як гістарычныя, так і тэарэтыка-метадалагічныя праблемы кніжнай культуры. У другі выпуск (2008 г.) [4] увайшлі даклады з Міжнароднага навукова-практычнага семінара «Кнігазнаўчыя даследаванні ў Беларусі і Польшчы: вопыт, арганізацыя, перспектывы (да 490-годдзя беларускага кнігавыдання)» (18 красавіка 2007 г.), у якім прынялі ўдзел вядучыя спецыялісты буйнейшых навуковых бібліятэк Беларусі, а таксама вядомыя польскія вучоныя. Бадай ці не ўпершыню ў Беларусі кожны з выступоўцаў спрабаваў зрабіць падсумаванні ў галіне кнігазнаўчай дзейнасці адпаведнай установы і акрэсліць планы развіцця навуковых даследаванняў. Трэці выпуск (2011 г.) [5] склалі матэрыялы выступленняў на «круглых сталах» – «Інфармацыйнае грамадства і бібліятэкі» (16 сакавіка 2011 г.), «Кніга як фактар

культуры і прадмет навуковых даследаванняў: гістарычная і сучасная перспектыва» (13 красавіка 2011 г.), у якіх прынялі ўдзел вучоныя з Расіі і Польшчы. Акрамя таго ў зборніку былі надрукаваны артыкулы даследчыкаў з Беларусі, Літвы і ЗША па тэорыі кнігазнаўства і кніжнай культуры, гісторыі і сучасным стане кнігавыдання, бібліятэчнай справы, чытання, распаўсюджвання і мастацтва афармлення кніг і кнігазбораў. У чацвёртым выпуску (2012 г.) [6] апублікаваны выступленні на XVIII Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, прысвечаных дням славянскага пісьменства і культуры (16–18 мая 2012 г.), дзе асаблівае месца было адведзена кругламу сталу «Рэстаўрацыя і захаванасць кніжных помнікаў: погляд прафесіяналаў», што адпаведна прадстаўлена дакладамі спецыялістаў з Беларусі, Расіі, Украіны, у якіх разглядаліся праблемы і асаблівасці рэстаўрацыі кніжных помнікаў, а таксама арганізацыя падрыхтоўкі кадраў у дадзенай галіне. Асноўную частку пятага выпуску (2014 г.) [7] таксама склалі даклады, што прагучалі на чарговых XIX (22–24 мая 2013 г.) і XX (20–23 мая 2014 г.) Міжнародных Кірыла-Мяфодзіеўскіх чытаннях, а таксама на тэарэтыка-метадалагічным семінары «Актуальныя праблемы бібліятэказнаўства, бібліяграфазнаўства і кнігазнаўства» (28 лютага 2014 г.). Цалкам жа змест зборніка адлюстроўвае стан сучасных даследаванняў у галіне тэарэтычных і гістарычных кнігазнаўчых пытанняў рукапіснай і друкаванай кніжнай спадчыны славянскіх народаў, беларускай кніжнасці і кніжнай культуры ў гістарыяграфічным і крыніцазнаўчым аспектах. Апублікаваны артыкулы аўтараў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Украіны і ЗША. Змешчаны ў гэтым выпуску і паказальнік зместу «Беларускай кнігі ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» 1–5 выпускаў (2006–2014 гг.), складзены Т.А. Дзем'яновіч. Шосты выпуск – «Часапрастора кнігі і бібліятэкі: навуковае і культурнае ўзаемадзеянне» ўнікальны тым, што ахвяраваны беларускаму кнігазнаўцу Валерыю Герасімаву з нагоды 60-годдзя з дня яго нараджэння. У складзе публікацый вылучаюцца навуковая і літаратурна-мастацкая часткі; працягваюцца і падтрымліваюцца традыцыйныя раздзелы зборніка, у якіх асвятляюцца пытанні тэорыі, метадалогіі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства кніжнай культуры, гісторыі беларускай кнігі і кніжных калекцый. Своеасаблівым у выпуску з'яўляецца раздзел «Personalia», дзе прадстаўлены праца і дзейнасць Валерыя Герасімава, а таксама літаратурныя творы яго сяброў і паплечнікаў. У зборнік увайшлі даклады ўдзельнікаў V Міжнароднага Кангрэса даследчыкаў Беларусі (Коўна, 2–4 кастрычніка 2015 г.), дзе ўпершыню была арганізавана секцыя «Кніжная культура Беларусі: гісторыя і тэорыя», якая складалася з наступных панэляў: «Бібліялагічныя даследаванні і канцэпцыі», «Сувязі беларускай культуры з Заходняй і Сярэдняй Еўропай», «Беларускія кірылічныя выданні XVI–XVIII стст.» Прэзентаваныя тэмы засведчылі ўплыў на даследчы працэс у галіне кніжнай культуры сусветных тэндэнцый – паглыбленне фундаментальнасці – з аднаго боку, з іншага – пашырэнне міжгаліновага і інтэрдысцыплінарнага складнікаў.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДУКІ

Актуальныя і запатрабаваныя кірункі развіцця навукі пра кнігу ў Беларусі і за яе межамі пацвярджаюць і сфарміраваныя ў зборніку рубрыкі – «Тэорыя кніжнай культуры», «Кніжная культура: гісторыя і крыніцазнаўства», «Гістарыяграфія кніжнай культуры», «Выдавецкая справа», «Мастацтва кнігі», «Кніжныя помнікі. Захаванне, рэстаўрацыя», «Кніжныя калекцыі», «Бібліятэчная справа», «Статыстыка друку», «Personalia», «Рэцэнзіі». Асаблівасцю структуры і зместу выпускаў «Беларускай кнігі ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» з'яўляецца комплекснасць і наданне асаблівай увагі арыгінальным матэрыялам па распрацоўцы тэарэтычных і метадалагічных пытанняў навукі пра кнігу ў кантэксце сучаснай парадыгмы кніжнай культуры.

На старонках «Беларускай кнігі ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» былі актуалізаваны такія тэарэтычныя пытанні, як *змест і аб'ём паняцця «беларуская кніга»* – аўтар В.Е. Лявончыкаў [1, с. 13–19], *крытэрыі вызначэння паняцця «нацыянальная кніга» ў дачыненні да беларускіх старадрукаваных выданняў XVI–XVIII стст.* – Т.І. Рошчына [8, с. 31–38], *стандартызацыя кнігазнаўчай тэрміналогіі* – В.А. Касап [1, с. 238–242], *праблемнае поле беларускай кнігазнаўчай навукі і адукацыі* – Л.І. Доўнар [2, с. 204–209], *метадалогія даследавання кніжнай культуры Беларусі* – М.В. Нікалаеў [1, с. 19–30], Д.У. Караў [2, с. 96–103], В.М. Герасімаў [2, с. 108–114], В. Валецкі [8, с. 21–33], Ю.М. Лаўрык [8, с. 38–71], *кніга ў сістэме культуры* – М.І. Крукоўскі [2, с. 52–55], М.А. Мажэйка [2, с. 49–52], *кніга і мова* – К. Мігань [6, с. 8–25], Л.І. Доўнар [6, с.32–48], В.М. Белакурскі, Ж.Я. Белакурская [6, с. 48–51], А.А. Жэлуновіч, В.В. Шунейка [6, с. 52–56], *фенаменалогія друкаванай кнігі* – Т.А. Сапега [2, с. 56–68], М.А. Мажэйка [5, с. 39–68], *сучасны стан і перспектывы кнігазнаўства і кніжнай культуры* – К. Мігань [4, с. 10–38], Т.А. Самайлюк [4, с. 39–47], *гістарычнае кнігазнаўства* – Ю.М. Лаўрык [7, с. 34–43], Л.І. Доўнар [7, с. 44–63], *праблемы тэрміналагічнай лексікі і семантыкі навукі пра кнігу* – К. Мігань [8, с. 12–23], *паняцце «кніжная культура» і яго складнікі* – К. Мігань [5, с. 17–39], *кампаратыўныя веды ў кніжнай культуры* – А.А. Павільч [5, с. 68–82], *міждысцыплінарнае ўзаемадзеянне ў фарміраванні базісных паняццяў кнігазнаўства* – Ю.У. Несцяровіч [7, с. 64–81; 8, с. 23–31], *метадалогія параўнальнага падыходу ў гісторыі кнігадрукавання* – К. Мігань [7, с. 21–33], *кніжная дзейнасць у сістэме бесперапыннай адукацыі* – Н.Ю. Вайцэховіч [7, с. 82–90], *тыпалогія дзіцячай кнігі* – Э. Огар [7, с. 91–112] і інш. Таксама і пытанні гісторыі, гістарыяграфіі і крыніцазнаўства кніжнай культуры не абыходзяцца без тэарэтычнай асновы, што пацвярджаюць і прадстаўляюць у зборніку артыкулы В.М. Герасімава, Ю.М. Лаўрыка, Т.І. Рошчынай, Т.А. Сапегі, А.В. Стэфановіча і інш.

Спрыяюць пашырэнню і развіццю айчыннай тэрміналогіі і публікацыі-пераклады на беларускую мову: з польскай – «Стан чытання ў Польшчы ў святле даследаванняў Інстытута кнігі і чытання Нацыянальнай бібліятэкі» (О. Чарнік) [4, с. 54–73], «Стан сучаснага кнігазнаўства як навукі» [4, с. 10–38], «Кніж-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

ная культура – спроба акрэслення паняцця як навуковай катэгорыі» [5, с. 17–39], «Мова – пісьмо – універсум пісьменства як паняцці кніжнай культуры ў сучаснай бібліялогіі» [6, с. 8–25], «Пачатак друкаванай кнігі на славянскіх мовах (праект параўнальнага падыходу)» (К. Мігань) [7, с. 21–33], з англійскай – «Развіццё кнігазнаўства ў Беларусі, 1917–1935» (З. Кіпель) [7, с. 123–133]. Таксама дзякуючы працам замежных аўтараў, апублікаваных на англійскай, польскай, рускай, украінскай мовах, дапаўняецца крыніцазнаўчая база беларускага кнігазнаўства, пашыраюцца метады і метадалогія даследаванняў. Да прыкладу, новыя метады і метадалогія даследавання былі прадстаўлены ў артыкулах А. Бразюнене, В. Валецкага, Л. Коўкель, С. Нарбутаса, С. Ю. Тэмчына, О. Чарніка.

Асаблівай каштоўнасцю і гонарам зборніка з'яўляюцца матэрыялы, прысвечаныя кнігазнаўцам, кніжнікам Беларусі: Вацлаву Ластоўскаму (вып. 3), Лідзіі Збралевіч (вып. 3), Міколу Грынчыку (вып. 5), Валерыю Герасімаву (вып. 6).

Безумоўна, дадзеныя публікацыі ці перакладчыцкая праца на беларускую мову ў галіне кнігазнаўства не могуць закрыць праблему стварэння ўласных айчынных даведкавых выданняў: тэрміналагічных слоўнікаў, энцыклапедый, пра што адзначалася таксама на старонках нашых зборнікаў у 2006 г. [1, с. 27–28], 2008 г. [4, с. 134], 2014 г. [7, с. 55], а таксама прапаноўваўся навукова-даследчы і выдавецкі праект стварэння энцыклапедыі «Кніжная культура Беларусі», што застаецца актуальным сёння і на бліжнюю перспектыву, бо існуе вострая патрэба абагульнення вынікаў развіцця кнігазнаўчай навукі ў Беларусі. Для практыкаў і даследчыкаў кніжнай справы падобная праца можа стаць кампетэнтнай кумуляванай крыніцай інфармацыі дасягненняў і планаў на перспектыву.

Выпуск зборніка навуковых прац «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» падтрымліваецца БДУКМ і адпаведна Міністэрствам культуры Рэспублікі Беларусь. Друкаваліся тэматычныя выпускі зборніка і дзякуючы грантавай дапамозе Беларускага рэспубліканскага фонда фундаментальных даследаванняў (2006 г.), Польскага Інстытута ў Мінску (2006, 2008, 2011 гг.), беларусаў замежжа (2014 г.) і ўласным грошам аўтараў (2015 г.).

Усяго ў зборніку «Беларуская кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры» за 10-годдзе надрукавана больш за 200 арыгінальных прац аўтараў з Беларусі, Літвы, Польшчы, Расіі, Славакіі, Украіны і ЗША, што, на нашу думку, не толькі спрые ўмацаванню навуковых сувязяў, пашырэнню кола даследаванняў у галіне беларускай кніжнай культуры, але і супольнаму абазначэнню і вырашэнню тэарэтыка-метадалагічных і метадычных праблем навукі пра кнігу.

## ЛІТАРАТУРА

1. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1]. У 2 ч. Ч. 1 / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – 242 с.

2. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. [Вып. 1]. У 2 ч. Ч. 2 / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Т. А. Дзем'яновіч, Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: М. А. Бяспалая (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2006. – 210 с.

3. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры [Электронны рэсурс] : матэрыялы міжнар. навук.-практ. канф. (Мінск, 7–8 лютага 2006 г.) / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў. – Электрон. дан. – Мінск, 2007. – 1 электрон. аптычны дыск (CD-ROM). – Сістэмныя патрабаванні: IBM PC, Windows 2000 і вышэй. – Загал. з футурала дыска.

4. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. арт. Вып. 2 / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк, Т. А. Дзем'яновіч ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2008. – 219 с.

5. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: гісторыя і сучаснасць : зб. навук. арт. [Вып. 3] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад. Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: Б. У. Святлоў (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2011. – 346, [1] с.

6. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры: выпучэнне і захаванне : зб. навук. арт. [Вып. 4] / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; рэдкал.: М. А. Мажэйка (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск, 2012. – 254 с. : іл. – (XVIII Міжнародныя Кірыла-Мяфодзіеўскія чытанні, прысвечаныя Дням славянскага пісьменства і культуры, «Кніга ў фарміраванні духоўнай культуры і дзяржаўнасці беларускага народа» (Мінск, 16–18 мая 2012 г.) : у 2 т. ; т. 2).

7. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры : зб. навук. прац. Вып. 5. Слова. Мова. Тэкст. Духоўны патэнцыял кніжнай культуры / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: Л. І. Доўнар (адказ. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Медыял, 2014. – 290 с.

8. **Беларуская** кніга ў кантэксце сусветнай кніжнай культуры. Вып. 6. Часапрастора кнігі і бібліятэкі: навуковае і культурнае ўзаемадзеянне : зборнік навуковых і літаратурна-мастацкіх прац, ахвяраваных Валерыю Герасімаву да 60-годдзя з дня нараджэння / Беларус. дзярж. ун-т культуры і мастацтваў ; склад.: Л. І. Доўнар, Т. А. Самайлюк ; рэдкал.: Л. І. Доўнар (адк. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Ковчег, 2015. – 389 с. : іл.

*The article is dedicated to the 10th anniversary of the scientific proceeding «The Belarusian book in the context of the world book culture»of the Belarusian State University of Culture and Arts. The basic ways, content structure of its 6 issues, especially noted the contribution of authors in the development of theoretical and methodological issues of the Belarusian book science are discussed.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

***Кажамякін Г.В.** (Мінск)*

## ФАКСІМІЛЬНАЕ І РЭПРЫНТНАЕ ЎЗНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКІХ КНІГ

У беларускім кнігазнаўстве важнае значэнне мае вывучэнне факсімільных і рэпрынтных узнаўленняў ранейшых выданняў. Гаворка ідзе і пра іх ролю ў культурна-асветніцкім працэсе, і пра ступень развіцця такога выдавецкага чыну.